ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА імя У.І. ЛЕНІНА"
СЕКТАР КРАЯЗНАЎЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ І БІБЛІЯГРАФІІ



# П.М.Явіч

ВІЦЕБСК
2008

**ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА»**
СЕКТАР КРАЯЗНАЎЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ І БІБЛІЯГРАФІІ

# Пётр Максавіч Явіч

*Біябібліяграфічны паказальнік*

**ВІЦЕБСК, 2008**

**ББК 91.9 : 85.143 (4 Беи-4 Вит)6-8**
**Я 19**

Складальнікі: Н.А. Пугачова, А.В. Ганчарова
Аўтар уступнага артыкула М.Л. Цыбульскі
Адказны за выпуск А.І. Сёмкін

**Пётр Максавіч Явіч** : біябібліяграфічны паказальнік / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», Сектар краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Н.А. Пугачова, А.В. Ганчарова]. – Віцебск, 2008. – 23 с. : іл.

Біябібліяграфічны паказальнік прысвечаны 90-гадоваму юбілею вядомага беларускага мастака, майстра рэалістычнага жывапісу Пятра Максавіча Явіча.

Выданне можа быць карысным мастацтвазнаўцам, культуролагам, гісторыкам, краязнаўцам, выкладчыкам мастацтвазнаўчых дысцыплін, студэнтам, школьнікам, бібліятэчным работнікам, а таксама ўсім, хто цікавіцца культурным жыццём горада Віцебска і Беларусі.

ББК 91.9 : 85.143 (4 Беи-4 Вит)6-8

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», 2008

# ПРАДМОВА

Культурныя традыцыі Прыдзвінскага краю маюць глыбокія і багатыя гістарычныя карані.

Віцебск увайшоў у гісторыю як адзін з цэнтраў мастацкага авангарду, а паняцці “Віцебская мастацкая школа” і “Віцебскі рэнесанс” яшчэ і сёння цікавяць гісторыкаў, мастакоў і навукоўцаў усяго свету.

З Віцебшчынай цесна звязана творчасць вядомых мастакоў М. Дабужынскага, І. Рэпіна, І. Хруцкага, М. Шагала. Тут, у 20-я гады мінулага стагоддзя была створана мастацка-філасофская школа К. Малевіча. У Віцебску працавалі і рыхтавалі вучняў І. Ахрэмчык, В. Дзежыц, Я. Мінін, Ф. Фогт, У. Хрусталёў.

У яркай гісторыі віцебскага мастацтва імя Пятра Явіча, аднаго з вучняў Ю. Пэна, звязваюць з лепшымі традыцыямі рэалістычнага жывапісу. Яго карціны ўключаны ў энцыклапедыі і ўпрыгожваюць многія выставачныя каталогі.

У 2008 годзе беларускі жывапісец адзначае сваё 90-годдзе. Наша выданне прысвечана гэтай даце.

Звесткі, уключаныя ў бібліяграфічны паказальнік, падрыхтаваны на аснове матэрыялаў, якія маюцца ў фондзе Віцебскай абласной бібліятэкі і адлюстроўваюць інфармацыю электроннага каталога, баз дадзеных, а таксама карткавых каталогаў і картатэк. Храналагічны ахоп бібліяграфічных запісаў пачынаецца з 1965 года.

Дапаможнік складаецца з двух раздзелаў.

Першы раздзел прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху П.М. Явіча, які ўключае ўступны артыкул, падрыхтаваны кандыдатам мастацтвазнаўства, дацэнтам кафедры выяўленчага мастацтва Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава М.Л. Цыбульскім. Апроч таго, у раздзел уключаны артыкулы з энцыклапедый, кніг, зборнікаў, газет і часопісаў. Матэрыялы перыядычнага друку размешчаны ў алфавітным парадку.

Другі раздзел змяшчае інфармацыю пра ўдзел П.М. Явіча ў мастацкіх выставах. У храналагічны пералік увайшлі персанальныя, а таксама асноўныя выставы рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню. Раздзел дапоўнены каталогамі выстаў, якія захоўваюцца ў фондах бібліятэкі. У храналагічным парадку падаюцца артыкулы з перыядычнага друку.

Бібліяграфічныя запісы, уключаныя ў паказальнік, адпавядаюць ДАСТ 7.1-2003 “Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення”.

Выданне мае імянны паказальнік.

Рэкамендуецца мастацтвазнаўцам, культуролагам, гісторыкам, краязнаўцам, выкладчыкам мастацтвазнаўчых дысцыплін, студэнтам, школьнікам, бібліятэчным работнікам, а таксама ўсім, хто цікавіцца культурным жыццём горада Віцебска і Беларусі.

## РАЗДЗЕЛ 1



Явіч Пётр (Іштван) Максавіч нарадзіўся 5.09.1918 г. ў г. Цэрэксентміклаш (Венгрыя). Беларускі жывапісец. Займаўся ў майстэрні Ю.М. Пэна. Скончыў Віцебскую мастацкую вучэльню (вучыўся ў Ф. Фогта, І. Ахрэмчыка, Л. Лейтмана) /1938/. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1926 г. жыве ў Віцебску.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Працуе пераважна ў алейным жывапісе ў розных жанрах. Аўтар жанравых кампазіцый “Мары” (1959), “Заложнікі” (1960), “Станаўленне савецкай улады ў Віцебску” (1968), “Дзеці Міная” (1978); партрэтаў “Дзяўчынка ў блакітным” (1948), народных артыстаў Беларусі А. Радзялоўскай (1948), М. Звездачотава, П. Малчанава (абодва 1949), “Маці” (1950), “М. Шмырова” (1952), “Сын” (1954), В. Харужай (1961), жонкі (1959, 1962), “Беларускі Сусанін” (М. Пасаманаў) (1968), “Алёнка” (1982), “Унук Пецька” (1990); аўтапартрэтаў (1947, 1948, 1988); пейзажаў “Каўказ” (1952), “Лужаснянка” (1983), “Астравы на Лучосе” (1990), “Лета” (1996); “Світанак над возерам” (1997), “Багна” (1998); нацюрмортаў.

## ЗАХАВАЛЬНІК РЭАЛІСТЫЧНЫХ ТРАДЫЦЫЙ ВІЦЕБСКАЙ МАСТАЦКАЙ ШКОЛЫ

Імя ПЯТРА ЯВІЧА, як і імя яго першага настаўніка ў мастацтве Юрыя Пэна, ведаюць і сапраўды высока цэняць прафесіяналы і аматары мастацтва. На сённяшні дзень ён без перабольшвання - ГОНАР І ЖЫВАЯ ЛЕГЕНДА БЕЛАРУСКАГА ЖЫВАПІСУ. ПАТРЫЯРХ І ЦЭЛАЯ ВЯХА Ў РАЗВІЦЦІ ВІЦЕБСКАГА МАСТАЦТВА.

Нягледзячы на свой ужо “немалады узрост”, Пётр Явіч з задавальненнем адгукаецца на запрашэнні прыняць удзел у разнастайных культурных імпрэзах, выставах, нават пленэрах... Творчай апантанасці гэтага мастака можна парадавацца і пазайздросціць. Яго незгасаючая цікавасць да жывапісу, хутчэй за усё, абумоўлена глыбокай улюблёнасцю ў прыгажосць наваколькага свету. Менавіта ў ім мастак чэрпае натхненне. Ён закаханы ў жыццё, адкрыты і вельмі ўважлівы да людзей. Ён даволі добразычліва ставіцца да самых разнастайных творчых захапленняў сваіх калег–мастакоў і шчыра гатовы зразумець кожнага. Увогуле, шчырасць для Пятра Явіча - гэта не толькі адметная рыса яго характару, але і відавочны прынцып жыцця ў мастацтве.

Пётр Явіч добра памятае сваю першую выставу (1940 г.), у якой прымаў удзел разам са сваімі выкладчыкамі па мастацкай вучэльні. А колькі потым было гэтых выстаў... Пра гэта могуць паведаць толькі самі творы, адны з якіх разышліся па музеях і прыватных калекцыях у свеце, а іншыя і сёння захоўваюцца ў доме-майстэрні мастака.

Сярод твораў Пятра Явіча - партрэты суайчыннікаў: слынных дзеячоў беларускай культуры і мастацтва, герояў вайны і працы, блізкіх і родных мастаку людзей, жанравыя кампазіцыі, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны. У кожнай з карцін мастака вялікая павага да традыцый рэалістычнага мастацтва, увасобленая ў высокай культуры мастацкай мовы, пластычнай выразнасці формы, глыбокай пранікнёнасці ў характар і псіхалогію ствараемага вобраза. А яшчэ часцінка душы, часу, эпохі…

У сваю чаргу яго нацюрморты – гэта, часам, сапраўдныя партрэты рэчаў, у вобразнасці якіх немагчыма не заўважыць высокай эстэтыкі прыгажосці. А безліч напісаных мастаком нацюрмортаў з кветкамі - рамонкамі, вяргінямі, ружамі, гваздзікамі, півонямі, бэзам, незабудкамі, віёламі - выдатна і красамоўна распявадае аб лірычным складзе яго творчай натуры.

Створаныя Явічам пейзажы ўражваюць пранікнёнасцю пачуццяў, уменнем мастака вельмі тонка ўспрымаць жывапісную мелодыку прыродных матываў. Сярод велізарнай колькасці жывапісных краявідаў шмат кампазіцый, прысвечаных Віцебску і яго ваколіцам.

“Ціхі голас” Пятра Явіча ў камерных па свайму вобразнаму ладу жывапісных кампазіцыях уражвае чысцінёй і сакавітым каларыстычным гучаннем. Тут відавочныя не толькі высокае прафесійнае майстэрства, школа і мастацкі густ. У творах мастака мы бачым увасобленыя ў мастацкіх вобразах імгненні вечнасці, якія немагчыма паўтарыць...

Творчасць П. Явіча непадуладна ўплывам часу. Яна цэласная і стылістычна канкрэтная. Жывапісныя кампазіцыі майстра – увасабленне адметнага і даволі значнага перыяду ў развіцці беларускага мастацтва. Гэта жывапісная класіка, узораў якой не так ужо і шмат у нашых музеях.

Нягледзячы на імклівы бег часу, мастак здолеў захаваць вакол сябе прадметнае асяроддзе блізкае і сугучнае яго мастацкаму бачанню. Кватэра жывапісца і сёння ўяўляе сабой уражваючы сімбіёз галерэі, творчай майстэрні і жылога памяшкання, у ауры якога выразна адчуваеш эпоху, якую прадстаўляе Пётр Явіч сваёй творчасцю. У гэтым інтэр’еры дома пакуль што ёсць усё. І галоўнае – цудоўныя творы. Варта толькі

гэта ўмела захаваць. Але ж размова ж пра кватэру–музей (ці музей-галерэю?) Пятра Явіча, здаецца, ужо стала паходзіць на нязбыўны міф.

... Няма пракокаў у сваёй Айчыне. Няспынна нагадваючы пра гэта, я, разам з тым, не перастаю здзіўляцца нашай гістарычнай абыякавасці і недальнабачнасці. Мы ўжо неаднойчы з вялікімі цяжкасцямі шукалі па ўсім свеце творы сваіх таленавітых суайчыннікаў. Не дай Божа паўтарыць гэта зноў.

Аб жыцці і творчасці Пятра Явіча выдадзены два цудоўныя альбомы, значным вехам у яго жыцці прысвечаны каталогі персанальных выстаў, артыкулы ў навуковых выданнях і перыядычным друку. Але ўсе гэтыя матэрыялы разам, прадстаўленыя ў гэтым бібліяграфічным даведніку, наўрад ці здольныя акрэсліць магутны чалавечы, духоўны і творчы патэнцыял МАЙСТРА. Яго імя і творчасць, на жаль, па-ранейшаму застаюцца, як адзначыў адзін з віцебскіх мастацтвазнаўцаў, "слаба засвоеным грунтоўным мастацтвазнаўчым досведам" (А. Прускі).

"Жыццё цудоўнае, - заўжды паўтарае Пётр Явіч, - і я сапраўды шчаслівы чалавек, таму, што маю магчымасць з усхваляванасцю і захапленнем назіраць за казачнай прыгажосцю прыроды, свету...".

Магчыма за гэту эмацыянальную чуллівасць, душэўную шчодрасць і імкненне жыць у гармоніі з навакольным светам Бог і ўзнагароджвае мастака і яго талент ВЯЛІКІМ ДАРАМ ТВОРЧАГА ДАЎГАЛЕЦЦЯ.

**Міхась Цыбульскі**
**кандыдат мастацтвазнаўства,**
**сябра Беларускага саюза мастакоў**

## ЛІТАРАТУРА АБ ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ


1. **Явіч Пётр Максавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : Беларуская энцыклапедыя, 2004. - Т. 18., кн. 1. – С. 227.

2. **Явіч Пётр Максавіч** // Беларускі саюз мастакоў : энцыклапедычны даведнік / аўт.-склад. Б.А. Крэпак [і інш.]. – Мн. : ВТАА "Кавалер Паблішэрс", 1998. – С. 645.

3. **Явіч Пётр Максавіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2003. – Т. 6, кн. 2. – С. 285.

4. **Явіч Пётр Максавіч** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал. І.П. Шамякін [і інш.]. - Мн. : Беларуская савецкая энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1987. – Т. 5. – С. 675-676.

5. **Пётр Явіч** : альбом рэпрадукцый мастака / аўт. тэксту і склад. А. Прускі. – Віцебск-Наваполацк, 1997. – 73 с.

6. **Пётр Явіч** : ілюстраваны альбом жывапісных твораў / склад. В. Рыбакоў, М. Рызо ; аўт. тэксту М. Гугнін. – Віцебск, 1999. – 159 с. : каляров. рэпрад. – На бел., рус., венг. і англ. мовах.

7. **Пётр Явіч** // Саюз творцаў : [фотаальбом] / уклад. і аўт. тэксту М.Л. Цыбульскі.- Мн. : Беларусь, 2005. – С. 144. - На бел. і англ. мовах.

8. **[Явич Петр Максович]** // Дробов, Л.Н. Живопись Советской Белоруссии (1917-1975 гг.) / Л.Н. Дробов ; под ред. А.С. Лиса. – Мн. : Вышэйшая школа, 1979. – С. 181, 237.

9. **[Явич Петр Максович]** // Мисюк, А.Е. Белорусская советская портретная живопись. 1917-1967 гг. / А.Е. Мисюк. – Мн. : Наука и техника, 1986. – С. 75-76.

10. **Явич Петр Максович** // Художники Советской Белоруссии / редкол. В.И. Версоцкий [и др.]. – Мн. : Беларусь, 1976. – С. 392.

11. **Явич, П.** Буду благодарен ему всегда / П. Явич // Шагаловский международный ежегодник, 2004 : в 2 т. / под ред. А. Подлипского. – Витебск : Витебская областная типография, 2005. – Т. 1. – С. 114-118.

12. **Буткевич, С.** «Как прекрасен этот мир!» / С. Буткевич // Народная газета. – 1995. – 28 сак. – С. 3.

13. **Вальфоўскі, В.** Мастак і яго героі / В. Вальфоўскі // Літаратура і мастацтва. – 1968. – 13 верас. – С. 2.

14. **Волкова, Л.** В Москве есть Третьяковская галерея, а в Витебске будет Явичская… / Л. Волкова // Віцьбічы=Витьбичи. – 1997. – 27 нояб. – С. 5.

15. **Іваноўскі, Ю.** Захаваў вернасць настаўніку / Ю. Іваноўскі // Віцебскі рабочы. - 2003. - 2 верас. - С. 4.

16. **Карлюкевич, А.** Последний звездочет / А. Карлюкевич // Советская Белоруссия. - 2004. - 18 нояб. - С. 7.

17. **Селюкова, И.** ... И весь птичий оркестр пел для него / И. Селюкова, Н. Крупица // Віцьбічы=Витьбичи. – 2004. – 9 сент. – С. 13.

18. **Пастернак, Т.** Красота жизни на полотнах Петра Явича / Т. Пастернак // Народнае слова. - 2006. - 19 верас. - С. 5.

19. **Пастернак, Т.** Презентация альбома П. Явича / Т. Пастернак // Народнае слова. - 2000. - 6 студз. - С. 1.

20. **Пастернак, Т.** Цветы для художника / Т. Пастернак // Народнае слова. - 1993. – 16 верас. – С. 2.

21. **Прускі, А.** Паміж мінулым і будучым / А. Прускі // Мастацтва. – 1997. - № 4. - С. 36-38.

22. **Прусский, А.** С Петром Явичем к Пэну... / А. Прусский // Мишпоха. - 2001. - № 10. - С. 102-105.

23. **Рябенкова, Г.** "Мастер прошлого века" / Г. Рябенкова // Віцебскі рабочы. - 2005. - 7 крас. - С. 5.

24. **Салаўёва, Н.** Нараджэнне прыгажосці / Н. Салаўёва // Витебский проспект. - 2006. - 13 июля. - С. 22.

25. **Степанская, Т.** Более 200 полотен подарил художник родному городу / Т. Степанская // Народнае слова. - 1997. - 20 лістап. - С. 3.

26. **Халецкі, А.** Пачуцці, perададзеныя ў фарбах / А. Халецкі // Ленінская праўда (Віцебскі раён). – 1987. – 1 снеж. – С. 3.

27. **Холодова, И.** Рядовой искусства / И. Холодова // Витебский курьер. - 1998. - 8 сент. - С. 3.

28. **Цыбульскі, М.** Пачуць ціхі голас / М. Цыбульскі // Віцьбічы=Витьбичи. - 2004. - 16 сент. - С. 6.

29. **Явич, П.М.** «И голодая, я «жил в масле» / П.М. Явич ; беседовала Н. Конохова // Вечерний Витебск. - 2001. - 19 янв. - С. 1, 3.

30. **Явич, П.М.** «Когда не работаю - болею» / П.М. Явич ; беседовала Н. Лукьянова // Народнае слова. – 2003. - 13 верас. – С. 5.

31. **Явич, П.М.** Мечта: подарить Витебску галерею / П.М. Явич ; беседовал А. Аввакумов // Свободные новости. – 2002. – 17-24 янв. – С. 11.

32. **Явич, П.М.** «Мне интересен характер человека, его внутренний мир» / П.М. Явич ; беседовала Т. Пастернак // Народнае слова. – 1998. – 5 верас. – С. 8.

## РАЗДЗЕЛ 2

## УДЗЕЛ П.М. ЯВІЧА Ў МАСТАЦКІХ ВЫСТАВАХ

Імя П.М. Явіча, беларускага жывапісца, добра вядома не толькі на Віцебшчыне, але і далёка за яе межамі. Яго творчыя работы экспанаваліся на абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных выставах, а таксама ў многіх краінах свету: Венгрыі, Японіі, Кітаі, Польшчы, Румыніі, В’етнаме, Карэі.

У мастацкіх выставах удзельнічае з 1940 года. З’яўляецца адным з першых арганізатараў пасляваенных выстаў у Віцебску.

Сення многія з карцін мастака знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах БСМ, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі і музеях іншых краін, набыты прыватнымі калекцыянерамі Венгрыі, Польшчы, Германіі, Бельгіі, Фінляндыі, Канады, Японіі, Англіі, ЗША, Ізраіля.





**На адкрыцці персанальнай выставы**
**ў Віцебскай абласной бібліятэцы, 2004 г.**

## АСНОЎНЫЯ ВЫСТАВЫ

- **1940 г.** Абласная мастацкая выстава. Віцебск.
- **1948 г.** Рэспубліканская выстава, прысвечаная 30-годдзю БССР. Мінск.
- **1949 г.** Выстава, прысвечаная 30-годдзю БССР. Масква.
- **1957 г.** Усесаюзная выстава. Масква.
- **1960-я гг.** Рэспубліканскія выставы. Мінск.
- **1968 г.** Персанальная выстава да 50-гадовага юбілею мастака. Віцебск.
- **1969 г.** Персанальная выстава. Мінск.
- **1970 г.** Выстава беларускіх мастакоў. Масква.
- **1974 г.** Выстава савецкіх мастакоў. Японія.
- **1978 г.** Персанальная выстава да 60-гадовага юбілею мастака. Віцебск.
- **1980 г.** Выстава беларускіх мастакоў. Румынія.
- **1982 г.** Рэспубліканская выстава. Мінск.
- **1987 г.** Выстава твораў мастакоў Віцебскай абласной арганізацыі СМ БССР. ГДР. Франкфурт-на-Одэры.
- **1988 г.** Персанальная выстава да 70-гадовага юбілею мастака. Віцебск.
- **1989 г.** Выстава на радзіме мастака. Цэрэксентміклаш. ВНР.
- **1989 г.** Персанальная выстава. Будапешт.
- **1996-1998 гг.** Выстава пленэра памяці І. Хруцкага. Віцебск-Полацк.
- **1998 г.** Персанальная выстава ў мастацкім центры “Маладзік”. Віцебск.
- **1998 г.** Юбілейная персанальная выстава да 80-гадовага юбілею мастака. Віцебск.
- **2003 г.** Выстава на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава. Віцебск.
- **2004 г.** Персанальная выстава ў Віцебскай абласной бібліятэцы.
- **2006 г.** Выстава ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.
- **2007 г.** Выстава “Кветкавы рай”. Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Мінск.
- **2008 г.** Персанальная выстава ў Цэнтры сучаснага мастацтва. Віцебск.

## КАТАЛОГІ ВЫСТАЎ

33. **Областная художественная выставка, посвященная 20-летию победы над фашистской Германией** : каталог / авт.-сост. П.М. Явич. – Витебск, 1965. – 14 с.

34. **Республиканская выставка произведений художников Витебской области** : каталог. – Мн., 1966. – С. 8.

35. **Областная художественная выставка, посвященная 50-летию Великой Октябрьской революции** : каталог / авт.-сост. П.М. Явич. – Витебск, 1967. – 22 с.

36. **50 год БССР і КПБ** : юбілейная абласная мастацкая выстаўка : каталог / аўт. уступ. арт. Г.П. Лебедзеў. – Віцебск, 1968. – 14 с.

37. **Выстаўка твораў мастака П.М. Явіча** : прысвечана 50-годдзю з дня нараджэння і 30-годдзю творчай дзейнасці : каталог / аўт. уступ. артыкула С. Буткевіч ; рэд. Ф. Сёмачкін. - Мн. : Полымя, 1968. – 26 с.

38. **"СССР – наша Родина"** : областная художественная выставка (15 сентября – 20 октября 1972 г.) : каталог / авт. вступ. статьи С. Буткевич ; ред.-сост. Ф. Гумен. – Витебск, 1972. – С. 8,13.

39. **Областная художественная выставка, посвященная 30-летию со дня освобождения Белоруссии и города Витебска от немецко-фашистских захватчиков** : каталог / авт. вступ. статьи Л. Дягилев. – Витебск, 1974. – С.12,18.

40. **Выстаўка твораў мастака П.М. Явіча** : прысвечана 60-годдзю з дня нараджэння і 40-годдзю творчай дзейнасці : каталог / склад. А.Ф. Кавалёў. - Віцебск, 1978. – 50 с.

41. **Выставка произведений художников Витебской областной организации СХ БССР. ГДР. Франкфурт-на-Одере** : каталог / авт. вступ. статьи Н. Гугнин ; сост. Г. Киселев [и др.]. – Витебск, 1987. – [12 с.].

42. **Выставка произведений художника П.М. Явича** : посвящена 70-летию со дня рождения и 50-летию творческой деятельности : каталог / сост. А.Ф. Ковалев. - Витебск, 1988. – 22 с.

43. **Выставка произведений витебских художников (Смоленск, январь, 1989 г.)** : каталог / авт. вступ. статьи Н.А. Гугнин. – Витебск, 1989. – С. 5.

44. **Выставка произведений художников г. Витебска** : каталог / авт. вступ. статьи Н. Гугнин ; сост. А.В. Ильинов, А.Н. Гвоздиков. – Витебск, 1989. – [8 с.].

45. **Первый пленэр памяти Ивана Хруцкого** : [каталог] / сост. Н.А. Гугнин. – Витебск, 1996. – [6 с.].

46. **"Мастакі Віцебска – "Славянскаму базару"** : каталог / аўт.-склад. М. Цыбульскі. – Віцебск, 2003. – [6 с.].

47. **Мастацкая выстаўка "Была вайна"** : каталог / склад. і аўт. тэксту М. Цыбульскі ; рэд. М. Драненка. - Віцебск, 2003. – С. 16-17.


50 год БССР і КПБ
ЮБІЛЕЙНАЯ
АБЛАСНАЯ
МАСТАЦКАЯ
ВЫСТАЎКА

П. М. ЯВИЧ

КАТАЛОГ
ВЫСТАВКА
РАБОТ ХУДОЖНИКОВ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ,
ПОСВЯЩЕННАЯ
30-летию ОСВОБОЖДЕНИЯ
БЕЛОРУССИИ И г. ВИТЕБСКА
ОТ НЕМЕЦКО-ФАШИСТСКИХ ЗАХВАТЧИКОВ
июль 1974 года

П. М. ЯВІЧ

Первый пленэр
памяти
Ивана
ХРУЦКОГО
Витебск
1996

УПРАВЛЕНИЕ
КУЛЬТУРЫ
ВИТЕБСКОГО
ОБЛИСПОЛКОМА
ВЫСТАВКА
ПРОИЗВЕДЕНИЙ
ХУДОЖНИКОВ
ВИТЕБСКОЙ
ОБЛАСТНОЙ
ОРГАНИЗАЦИИ
СХ БССР
Живопись
Графика
ГДР
ФРАНКФУРТ-НА-ОДЕРЕ

РЕСПУБЛИКАНСКАЯ
ВЫСТАВКА
ПРОИЗВЕДЕНИЙ ХУДОЖНИКОВ
ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ
г. Минск, 1966 г.

60 гадоў
вызвалення Віцебска і Беларусі
ад фашысцкіх захопнікаў прысвячаецца
БЫЛА
ВАЙНА

БССР КПБ
ВЫСТАВКА
ПРОИЗВЕДЕНИЙ ХУДОЖНИКОВ
г. ВИТЕБСКА
КАТАЛОГ

## МАСТАЦКІЯ ВЫСТАВЫ Ў ДРУКУ

48. **Буткевіч, С.** Яснай мовай рэалізму / С. Буткевіч // Віцебскі рабочы. – 1968. – 8 кастр. – С. 3.

*Пра адкрыццё выставы, прысвечанай 50-годдзю з дня нараджэння мастака: Віцебск.*

49. **Новікава, Н.** Юбілейная выстаўка мастака // Н. Новікава / Віцебскі рабочы. – 1978. – 7 верас. – С. 3.

*Пра выставу, якая адкрылася ў выставачнай зале абласнога цэнтра.*

50. **Кавалёў, А.** У цэнтры – вобраз сучасніка / А. Кавалёў // Віцебскі рабочы. – 1978. – 3 кастр. – С. 4.

*Пра юбілейную выставу мастака: Віцебск.*

51. **Кавалёў, А.** Не толькі справаздача / А. Кавалёў // Літаратура і мастацтва. – 1978. – 6 кастр. – С. 10.

*Пра персанальную выставу твораў П. Явіча: Віцебск.*

52. **Васільеў, А.** Галоўная тэма творчасці / А. Васільеў // Звязда. – 1978. – 10 кастр. – С. 4.

*Пра мастацкую выставу, якая прысвечана 60-годдзю з дня нараджэння П.М. Явіча і 40-годдзю яго творчай дзейнасці: Віцебск.*

53. **Гугнін, М.** Любоў да жыцця / М. Гугнін, А. Кавалёў // Віцебскі рабочы. – 1989. – 16 жн. – С. 4.

*Пра юбілейную мастацкую выставу мастка і яго творчасць.*

54. **Газин, Д.** "Творите! И благословит Вас Бог!" / Д. Газин // Віцьбічы=Витьбичи. - 1998. - 16 окт. - С. 7.

*О выставке картин П.М. Явича в Витебском художественном музее.*

55. **Крупица, Н.** Дарю цветы влюблённым / Н. Крупица // Віцьбічы=Витьбичи. - 2001. - 24 февр. - С. 5.

*О выставке, которая проходит в Витебском областном краеведческом музее.*

56. **Крупица, Н.** XX век Петра Явича / Н. Крупица // Віцьбічы=Витьбичи. - 2001. - 20 сент. – С. 8.

*О ретроспективной выставке, которая открылась в художественном музее г. Витебска.*

57. **Метла, А.** Живописный портрет / А. Метла // Витебский курьер. - 2002. - 13 сент. - С. 4.

*Об открытии выставки в Витебском областном краеведческом музее.*

58. **Пастернак, Т.** Сентябрьские вернисажи / Т. Пастернак // Народнае слова. - 2002. - 14 верас. - С. 5.

*О выставке портретов в областном краеведческом музее.*

59. **Мукомол, Л.** Поэзия, которую можно посмотреть Л. Мукомол // Гарадоцкі веснік - 2003. - 29 сак. - С. 2.

*О выставке художника в Городке.*

60. **Павлова, Е.** Юбилей Петра Явича / Е. Павлова // Витебский курьер. - 2003. - 13 мая. - С. 2.

*О выставке работ, размещенной в выставочном зале художественно-графического факультета Витебского государственного университета имени П.М. Машерова.*

61. **Крупица, Н.** И завтра снова в мастерскую / Н. Крупица // Віцьбічы=Витьбичи. - 2003. - 13 сент. - С. 5.

*О художественной выставке, размещенной в здании Витебского областного краеведческого музея.*

62. **Павлова, Е.** Выставка Петра Явича / Е. Павлова // Витебский курьер. - 2004. - 10 сент. - С. 2.

*Об открытии выставки в Витебской областной библиотеке.*

63. **Пастернак, Т.** Вернисаж Петра Явича / Т. Пастернак // Народнае слова. - 2004. - 11 верас. - С. 8.

*О выставке, представленной в фойе Витебской областной библиотеки.*

64. **Соловьева, Т.** Художник, который дарит цветы / Т. Соловьева // Витебский проспект. - 2006. - 21 сент. - С. 2.

*О выставке картин, которая открылась в одном из залов Витебского областного краеведческого музея.*

## ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК


| | |
|---|---|
| **Аввакумов А.** | 31 |
| **Буткевіч С.** | 37, 48 |
| **Буткевич С.** | 12, 38 |
| **Вальфоўскі В.** | 13 |
| **Васільеў А.** | 52 |
| **Версоцкий В.И.** | 10 |
| **Волкова Л.** | 14 |
| **Газин Д.** | 54 |
| **Гвоздиков А.Н.** | 44 |
| **Гугнін М.** | 6, 43, 53 |
| **Гугнин Н.** | 41, 44, 45 |
| **Гумен Ф.** | 38 |
| **Драненка М.** | 47 |
| **Дробов Л.Н.** | 8 |
| **Дягилев Л.** | 39 |
| **Ильинов А.В.** | 44 |
| **Іваноўскі Ю.** | 15 |
| **Кавалёў А.** | 50, 51 |
| **Карлюкевич А.** | 16 |
| **Киселев Г.** | 41 |
| **Ковалев А.Ф.** | 40, 42 |
| **Конохова Н.** | 29 |
| **Крупица Н.** | 17, 55, 56, 61 |
| **Крэпак Б.А.** | 2 |
| **Лебедзеў Г.П.** | 36 |
| **Лис А.С.** | 8 |
| **Лукьянова Н.** | 30 |
| **Метла А.** | 57 |
| **Мисюк А.Е.** | 9 |
| **Мукомол Л.** | 59 |
| **Новікава Н.** | 49 |
| **Павлова Е.** | 60, 62 |
| **Пастернак Т.** | 18, 19, 20, 32, 58, 63 |
| **Пашкоў Г.П.** | 1, 3 |
| **Подлипский А.** | 11 |
| **Прускі А.** | 5, 21 |
| **Прусский А.** | 22 |
| **Рыбакоў В.** | 6 |
| **Рызо М.** | 6 |
| **Рябенкова Г.** | 23 |

| | |
|---|---|
| **Салаўёва Н.** | 24 |
| **Селюкова И.** | 17 |
| **Сёмачкін Ф.** | 37 |
| **Соловьева Т.** | 64 |
| **Степанская Т.** | 25 |
| **Халецкі А.** | 26 |
| **Холодова И.** | 27 |
| **Цыбульскі М.** | 7, 28, 46, 47 |
| **Шамякін І.П.** | 4 |

**ПЁТР МАКСАВІЧ ЯВІЧ**

Біябібліяграфічны паказальнік

2008 г.

**Складальнікі:** Н.А. Пугачова, А.В. Ганчарова

**Аўтар уступнага артыкула** М.Л. Цыбульскі

**Рэдакцыйная калегія:** Т.М. Адамян (галоўны рэдактар),

Н.Л. Варапаева, А.М. Лемеш, В.М. Нявейкава, В.М. Аўсяннікава,

Н.А. Пугачова, Н.А. Філімонава

**Мастацкае афармленне** А.В. Юпатава, Е.М. Грашавік

**На вокладцы** карціна «Півоніі» П.М. Явіча

**Адказны за выпуск** А.І. Сёмкін

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

Наклад 37 экз.

210601, Віцебск, Леніна, 8–а

**E–mail:** vrlib@lib.vitebsk.net